УДК 947.6

# МАЛАЯ РАДЗІМА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Г. Я. Аляксюціна**
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
г. Магілёў, Беларусь

Вёска Вець – адна з найбольш вядомых і старажытных на Быхаўшчыне. Пра засяленне гэтага месца ў далекім мінулым сведчаць старажытная стаянка за 0,5 км на поўдзень ад вескі на левым беразе р. Гутлянка і стаянка неаліту і бронзавага веку за 0,9 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе возера Станавое. Сучасная вёска вядома з 17 стагоддзя. Апрача земляробства, вяскоўцы займаліся адыходным, кравецкім, шавецкім, бандарным, кавальскім і кушнерскім промысламі [1, с. 244]. З 1919 г. вёска Вець увاходзіла ў склад Гомельскай губерніі РСФСР. У 1920 г. вёска складала 127 двароў. У ёй знаходзіліся дзве майстэрні па рамонту сельска-гаспадарчага інвентару, ветраны млын, крупадзерка; створана 4-гадовая школа. Арганізаваны калгас «Перамога», але прынялі ўдзел не ўсе вяскоўцы, бо сярод жыхароў былі стараверы.

Напярэдадні вайны вёска ўваходзіла ў склад Доўскага, а затым Журавіцкага раёнаў Гомельскай вобласці. Напэўна, гэты факт стварыў потым шэраг праблем з пошукам вяскоўцаў, што згінулі ў Вялікую Айчынную без вестак. З ліпеня 1941 г. вёска Вець была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія спалілі большасць двароў (126 са 145-ці) і загубілі сем жыхароў.

Вызваленне Быхаўшчыны пачалося ў кастрычніку 1943 г. Прарваўшы нямецкую абарону на р. Сож, войскі 3-й арміі Беларускага фронта (камандуючы генерал-лейтэнант А. В. Гарбатаў) і 50-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант І. В. Болдзін) Заходняга фронта выйшлі на Дняпроўскі рубеж. Пачалося вызваленне левабярэжнай часткі Быхаўскага раёна. Больш за сем месяцаў лінія фронту праходзіла па Быхаўскім раёне. Вёска Вець разам з суседнімі была вызвалена ў лістападзе (25–27-га) 1943 г. Доўгім і складаным быў шлях вызвалення.

Раніцай 25 лістапада 1943 г. 80-ы корпус 3-й арміі, якім камандаваў генерал-маёр Іван Лявонцьевіч Рагуля, разгарнуў баявыя дзеянні за вызваленне Быхаўскага раёна. На Палянінавічы і Сялец наступала 283-я Чырванасцяжная стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка В. А. Каналава. К вечару таго ж дня 858-ы стралковы полк падпалкоўніка А. М. Карабейнікава авалодаў Сяльцом і перарэзаў шашу Магілёў – Гомель. На поўдзень ад Абідавіч да шашы выходзіў 860-ы стралковы полк маёра А. С. Нябайкіна. Зламаўшы супраціўленне ворага каля Хатоўні, у раён вёскі Вець набліжаліся часці 17-й стралковай дывізіі палкоўніка Раманенкі. 362-я Чырванасцяжная стралковая дывізія генерал-маёра В. Н. Далматава развівала наступленне на Хачынку і Бахань, прыкрываючы правы фланг корпуса ад удару праціўніка з поўначы.

На наступны дзень войскі корпуса авалодалі рубяжом Палянінавічы – Сялец – Абідавічы – Вець. Гэта вельмі занепакоіла фашысцкае камандаванне, і яно ўзмацніла націск, каб вярнуць шашу і аднавіць сувязь сваіх раз'яднаных груповак.

17-я стралковая дывізія ўзяла Вець і адбівала атакі ворага з поўдня. Увечары стала ўскладняцца становішча 283-й дывізіі. У 19 гадзін гітлераўцы абрушылі на Сялец і раён на поўдзень ад яго ўраганны кулямётны і артылерыйска-мінамётны агонь, а потым перайшлі ў контратаку. Нашы падраздзяленні вымушаны былі пакінуць Сялец і замацаваліся на паўднёвым беразе р. Баброўка. Раніцай 26 лістапада вораг пераўзыходзячымі сіламі двойчы атакаваў 858-ы стралковы полк. Першую атаку ўдалося адбіць, пасля другой нашы байцы адышлі на 5–6 кіламетраў і замацаваліся.

860-му палку і часцям 17-й стралковай дывізіі пры падтрымцы карпуснай артылерыі ўдалося ўтрымаць Абідавічы. На працягу дня было адбіта пяць контратак праціўніка. Выключны гераізм праявілі нашы воіны. Шквал агню абрушылі на ворага мінамётчыкі. Асабліва храбра дзейнічаў разлік камсамольца Івана Занькіна. Разлік сяржанта Ягора Папова выкаціў гармату на адкрытую пазіцыю і прамой наводкай знішчыў станковы, два ручныя кулямёты і каля 15 варожых салдат. Бранябойшчыкі ўзвода супрацьтанкавых ружжаў Іван Караткоў і Дзмітрый Леўчанка падбілі па танку. Разлік 45-мм гарматы сяржанта Васіля Палтарабаткі сваім агнём адсек варожую пяхоту ад танкаў. Кулямётны разлік Віктара Абрамава знішчыў 17 фашыстаў. Камандзір аддзялення камуніст Канстанцін Смірноў пры артылерыйскім налёце ворага сваім целам прыкрыў камандзіра ўзвода. Сам быў паранены, але выратаваў камандзіра. Бранябойшчык Мікалай Іваноў пад агнём ворага вынес з поля бою цяжка параненага камандзіра ўзвода лейтэнанта Банчанку. Санітар Уладзімір Цыганкоў на працягу дня вынес з поля бою 18 параненых салдат і афіцэраў. Ездавы Віктар Круцікаў пад агнём праціўніка ўвесь дзень бесперапынна дастаўляў боепрыпасы на агнявыя пазіцыі разлікаў. Тэлефаніст Аляксей Васенка ў складаных умовах падтрымліваў бесперапынную сувязь. Ён быў паранены, але не пакінуў поля бою, пакуль не былі адбіты варожыя атакі. Падраздзяленні палка за дзень знішчылі каля 200 варожых салдат і афіцэраў, падбілі і спалілі чатыры танкі і самаходныя гарматы. Шаша засталася за савецкімі войскамі разам з вёскамі Вець, Абідавічы, Сялец і Палянінавічы. Рух ворага на поўдзень і на поўнач па ёй быў спынены [2].

Колькі жыхароў вёскі загінула ў гады Вялікай Айчыннай вайны, невядома. Імёны большасці з іх пазначаны ў Кнізе памяці. Былая жыхарка вёскі Н. Я. Якімава на ўласныя грошы з дапамогай сельскага савета і жыхароў у 2010 г. ўстанавіла памятны знак у гонар пяцідзесяці аднавяскоўцаў, што не вярнуліся з вайны. На беразе ракі на ўскрайку вёскі, там, дзе ў сорак трэцім ішлі жорсткія баі за вызваленне Быхаўшчыны, знаходзіцца зараз сімвалічнае месца ўшанавання памяці вятлян, што загінулі на вайне.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Т. 5, кн. 1: Магілеўская вобласць / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – С. 244.

2. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Быхаўскага раёна. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 1990.